спрактыкаваны чалавек’, *марскі воўк* ‘бывалы, вопытны марак’, *стары верабей* ‘вельмі вопытны, спрактыкаваны чалавек’ і інш.;

***– невялікі жыццёвы вопыт:****молада-зелена* ‘нявопытны, наіўны па маладосці гадоў’, *жаўтаротае птушаня* ‘вельмі малады, нявопытны, наіўны чалавек’ і інш.;

***– багацце, дастатак у чалавека****:залаты мяшок* ‘вельмі багаты чалавек ці капіталісты, буржуазія як клас’ і інш.;

***– беднасць, бязвыхаднае становішча****:голь пракатная* ‘бедны, збяднелы ці маральна заняпалы чалавек’, *гол як сокал* ‘вельмі бедны’ і інш.;

***– сямейнае ці сацыяльнае становішча (сям’ю):****саламяная ўдава* ‘жанчына, якая часова засталася без мужа або афіцыйна не мела яго’, *дарагая палавіна* ‘жонка ці муж’ і інш.;

***– фразеалагічныя адзінкі са значэннем ‘крыклівы чалавек’:*** *галасістае горла* (Віганцы Воран.), *усіх сабак перабрэша* (Паляцкішкі Воран),*свіная пошта* (Забалаць Воран);*пусты млын,базарная баба, пустая малатарня* і інш.

***– характарызуюць людзей паводле іх ролі ў грамадстве, адносінах да іншых, становішча сярод іншых***: *ні каза ні карова* ‘пасрэдная, якая нічым асаблівым не вылучаецца’ (Радунь Воран.), *ні то ні сё* ‘чалавек, які нічым не вылучаецца’ (Віганцы Воран.) і інш.

Такім чынам, даследаванне адзінак са значэннем асобы дазваляе яшчэ раз атрымаць уяўленне пра чалавека праз адзін з найбольш выразных моўных сродкаў – фразеалагізмы дыялектнай і літаратурнай моў.

ЛІТАРАТУРА:

1. Шанский, Н. М. Фразеология современного русского языка / Н. М. Шанский. – М., 1985. – 160 с.

## ЗНАКАВЫ СІМВАЛІЗМ БЕЛАРУСКАЙ ВЫШЫВАНКІ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Кафедра рускай і беларускай моў
**Кісялевіч А.С., студэнт 4 курса медыка-псіхалагічнага факультэта**
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

Любы старажытны ўзор мае сэнс, значэнне і культурнае напаўненне. Нацыянальны каларыт, нацыянальная асаблівасць – вось што заўсёды цікавіла даследчыкаў. І тым больш цікава, калі гэта – асаблівасц ькаларыту тваёй Радзімы.

Ёсць традыцыйны набор знакаў і кветак, якія выкарыстоўвалі нашы продкі шмат стагоддзяў з дахрысціянскіх часоў. Беларусы, а калісьці і ўсе славяне, ужывалі два колеры – чырвоны колер на белым фоне. Гэтыя колеры маюць глыбокую сімволіку. Белы фон – колер чысціні. Чырвоны – колер сонца, крыві як знака жыцця, і наогул сімвал жыцця.



Репозиторий ГрГМУ

У беларусаў, як ні ў каго са славян, да XX стагоддзя захавалася чысціня ўзораў. Нашы карані – чырвоны ўзор на белым фоне. З канца XIX стагоддзя дадаўся чорны колер. Але ён ніколі не пераважаў, толькі адцяняў чырвоны.Усе астатнія колеры ніколі не выкарыстоўваліся ў нашых арнаментах.

Прапаную пазнаёміцца з некаторымі ўзорамі крыху бліжэй.

1. Сонечны знак – ромб з атожылкамі. Цікава, што на старажытных касцяных або драўляных вырабах, на жаночых грабянях, якія насілі на галаве і якія павінны былі быць засцярогамі, сонечны знак малявалі як кружочак з кропкай пасярэдзіне. Чаму тут намаляваны ромб? Усё проста, пры вышыўцы цяжка было зрабіць круг. Таму круг трансфармаваўся ў ромб. Ромб з загнутымі канцамі, так званая свастыка, – таксама сонечны знак, знак кругазвароту сонца.

2. Сімвал чалавека – васьміканцовая разетка.

3. Дрэва жыцця – традыцыйна сімвалізуе святое дрэва жыцця – сімвал неўміручасці і вечнага жыцця.

4. Вядомым сюжэтам з'яўляецца біблейская гісторыя Адама і Евы, калі сарвалі забаронены плод з дрэва жыцця, за што іх выгналі з Раю. Хрысціянская культура дае гэтаму вектару менавіта такое тлумачэнне. Акрамя гэтага беларусы, як і астатнія славянскія народы, шанавалі дрэвы.

5. Ярыла на кані – старажытнаславянскае бажаство сонца і ўрадлівасці.

Дзіда ў руках бажаства сімвалізуе зброю, пры дапамозе якой ён перамог крыважэрнага змея. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў беларускіх легендах.

6. Сімвал продкаў – узор ўвасабляе ў сваім родзе малітву, прашэнне да Бога, за памерлых родных і блізкіх. Каб яны апынуліся ў Раі, зямля была пухам, а сонца саграваля іх.

Беларускія ўзоры –гэта самабытныя каларытныя элементы, унікальныя сваім старажытным паходжаннем, а таксама арыгінальным выглядам. Іх ужыванне не губляе папулярнасці з даўніх часоў і па сённяшні дзень. Нашэнне ўзораў стала асаблівым відам патрыятызму, праяўленага да сваёй краіны.

   

## КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ ЎРАЧА

УА «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
**Козел К.А., студэнтка 1 курса педыятрычнага факультэта**
Кафедра беларускай і рускай моў
Навуковы кіраўнік – м.ф.н. Носік А.А.

Прафесія ўрача заўсёды вылучалася сярод астатніх. Яна адна з самых высакародных, гуманных і неабходных прафесій на зямлі. Сакрат казаў: “Усе прафесіі ад людзей і толькі тры ад Бога: Настаўнік, Суддзя і Урач”. Да ўрача заўсёды ставіліся з асаблівай павагай,бо далёка не кожнаму пад сілу ахвяраваць

Репозиторий ГрГМУ